УДК 7.036:001.891.5“20”

# Эксперымент як творчая парадыгма сучаснага мастацтва

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*Найважнейшай характарыстыкай мастацкай культуры як XX, так і пачатку XXI стагоддзя застаецца “дух радыкальнага эксперымента”. Эксперымент з’яўляецца неад’емным паняццем не толькі некласічнага, але і традыцыйнага мастацтва. Скіраванасць на эксперымент зблізіла мастакоў розных краін, а абмен творчым вопытам садзейнічаў не толькі развіццю дыялогаў у межах міжнародных выставачных экспазіцый, але і стварэнню новых сінтэтычных форм мастацтва, якія аб’ядналі элементы розных традыцый.*

*У артыкуле вызначаецца паняцце “эксперымент” у кантэксце сучасных мастацкіх працэсаў. Узнікненне ўсіх эксперыментальных форм у мастацтве абумоўлена жаданнем выказваць праз змест і форму твора характар, асаблівасці, “дух” часу. Эксперымент у мастацтве, так ці інакш (а часам вельмі тоесна!), злучаны з цікавасцю творцаў да актуальных праблем нашага жыцця (сацыяльных, эканамічных, экалагічных, гендарных і г.д.). Мастакі выкарыстоўваюць уласныя творы як платформу для выказвання асабістых поглядаў на рэаліі свету. Яны могуць быць даволі нязвыклымі і іранічнымі, але заўсёды накіраваны на тое, каб выклікаць у гледача адпаведную рэакцыю.*

*Разнастайнасць відаў, жанраў, форм сучаснага мастацтва сваім з’яўленнем і развіццём абавязаны эксперыменту, які злучаны з рознымі лакацыямі. Кожная з іх прадстаўляе творцам пэўны дыяпазон навацый і адпаведную свабоду эксперыментальных пошукаў. У артыкуле прааналізаваны асноўныя лакацыі эксперымента, сярод якіх: выкарыстанне мастаком у адным творы магчымасцяў розных відаў мастацтва, іх сродкаў выразнасці і асобных элементаў, змест і паэтыка мастацкага твора, форма і сродкі выразнасці, новыя формы камунікацыі.*

***Ключавыя словы:*** *эксперымент, пошук, эксперыментальнае мастацтва, мастацтва пачатку XXI стагоддзя, актуальныя праблемы тэорыі і практыкі мастацтва, навацыі ў мастацтве.*

*(Искусство и культура. — 2025. — № 3(59). — С. 43–47)*

# Experiment as a Creative Paradigm of Contemporary Art

***Tsybulsky M.L.***
*Education Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*The most important characteristic of artistic culture in both the 20th and early 21st centuries remains the “spirit of radical experimentation”. Experimentation is an integral concept not only of non-classical but also of traditional art. The focus on experimentation brought artists from different countries together, and the exchange of creative experience contributed not only to the development of dialogues within the framework of international exhibitions, but also to the creation of new synthetic forms of art that combined elements of different traditions.*

*The article defines the concept of “experiment” in the context of modern artistic processes. The emergence of all experimental forms in art is due to the desire to express the character, features, “spirit” of the time through the content and form of the work. Experimentation in art, one way or another (and sometimes very identically!), is connected with the interest of creators in the current problems of our life (social, economic, environmental, gender, etc.). Artists use their works as a platform for expressing personal views on the realities of the world. They can be quite unusual and ironic, but are always aimed at evoking an appropriate reaction in the viewer.*

*The variety of types, genres, and forms of modern art owe their emergence and development to an experiment connected with different locations. Each of them presents creators with a certain range of innovations and the corresponding freedom of experimental searches. The article analyzes the main locations of the experiment, including: the artist’s use of the possibilities of different types of art, their means of expression and individual elements in one work, the content and poetics of the work of art, the form and means of expression, new forms of communication.*

***Key words:*** *experiment, search, experimental art, art of the beginning of the 21st century, current problems of the theory and practice of art, innovations in art.*

*(Art and Cultur. — 2025. — № 3(59). — P. 43–47)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru — М.Л. Цыбульскі*

У XX стагоддзі сфарміравалася мноства мастацкіх напрамкаў, якія пашырылі гарызонты мастацтва і арганічна ўпісаліся ў яго структуру. Пачатак XXI стагоддзя прадэманстраваў неверагодную свабоду выбару творцай шляхоў самарэалізацыі. Разам з тым шырокі дыяпазон існуючых сёння мастацкіх практык паказвае, што сучасным мастакам дастаткова складана стварыць нешта кардынальна новае. Нават на буйных сусветных выставах мы звычайна бачым пераасэнсаванне ўжо знойдзенага раней. Але гэта зусім не азначае, што мастакі сёння гатовы адмовіцца ад пошукаў падкрэслена новых, арыгінальных мастацкіх рашэнняў вобразаў і форм. Менавіта таму найважнейшай характарыстыкай мастацкай культуры як XX, так і пачатку XXI стагоддзя застаецца "дух радыкальнага эксперымента" [1, с. 17].

Мэта артыкула — выявіць асноўныя асаблівасці эксперымента ў мастацтве XXI стагоддзя, яго лакацыі і ролю ў развіцці сучасных мастацкіх практык.

**Эксперыментальнасць — неад'емная рыса мастацтва.** У шырокім сэнсе "ўсе віды матэрыяльнай і духоўнай культуры ўзніклі і развіваюцца ў ходзе эксперыментаў, сродкам якіх з'яўляецца прымяненне метаду «спроб і памылак», а мэтай — стварэнне розных прадуктаў для задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб чалавека і грамадства ў цэлым" [2, с. 80]. Такім чынам, эксперымент ёсць неад'емнае паняцце не толькі некласічнага, але і традыцыйнага мастацтва. "У рэчаіснасці наўрад ці ўжо магчыма мастацтва, якое б не эксперыментавала" [3, с. 58].

Найбольшае распаўсюджванне паняцце "эксперымент" атрымала на мяжы XIX–XX стст. у еўрапейскай прасторы, дзе ў гэты час узнікла і большасць навацыйных форм мастацтва. Перыяд мадэрнізму, прадстаўнікі якога лічылі "эксперымент" сваім праграмным метадам, зрабілі папулярным у дачыненні да мастацтва і слова "лабараторыя", як месца для правядзення эксперыментаў. Прыкметна, што ўжо ў творчасці мастакоў-мадэрністаў у першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя эксперымент пачынаў свой шлях як новая творчая парадыгма. Мастацтва ж другой паловы мінулага стагоддзя пацвердзіла парадыгмальны статус эксперымента, пашырыла яго межы, магчымасці і камунікатыўныя функцыі.

Рост глабалізацыйных працэсаў у культуры апошняй чвэрці XX стагоддзя, уплыў эксперыментальнага мастацтва і творчай актыўнасці ў розных рэгіёнах свету зрабілі іх сапраўднымі цэнтрамі інавацый. Скіраванасць на эксперымент зблізіла мастакоў розных краін, а абмен творчым вопытам садзейнічаў не толькі развіццю дыялогаў у межах міжнародных выставачных экспазіцый, але і стварэнню новых сінтэтычных форм мастацтва, якія аб'ядналі элементы розных традыцый. Тым не менш паняцце "эксперымент" у сістэме паняційна-катэгарыяльнай базы тэорыі і практыкі мастацтва XX стагоддзя не набыла дакладнай і адназначнай фармулёўкі. Не быў у поўнай меры выкарыстаны эксперымент і як ключавы параметр, які адлюстроўвае глыбінныя сувязі гістарычна канкрэтных актуальных мастацкіх практык і ключавыя тэндэнцыі ў развіцці мастацтва на тым ці іншым этапе. Па-за межамі ўвагі мастацтвазнаўцаў застаўся і аналіз гістарычнай дынамікі сэнсавага напаўнення гэтай катэгорыі, якая ўласціва мастацтву практычна ўсіх эпох.

У першыя дзесяцігоддзі XXI стагоддзя цікавасць да аналізу і пераасэнсавання шэрагу ключавых паняццяў тэорыі і практыкі сучаснага мастацтва актывізавалася ў сувязі з пашырэннем дыяпазону актуальных мастацкіх практык. Аднак гэтыя працэсы амаль не закранулі паняцце "эксперымент". У дачыненні да сучасных мастацкіх працэсаў "эксперымент", як і многія іншыя паняцці, што выкарыстоўваюцца для аналізу аб'ектаў мастацтва, характарызуецца рухомасцю і нявызначанасцю фармулёвак (тлумачэнняў). У адрозненне ад дакладных навук, дзе нарадзіўся і імкліва развіваецца новы навуковы кірунак — тэорыя эксперымента, у рэчышчы мастацтва падобныя тэарэтычныя пошукі не вядуцца. Тэорыя эксперымента ў мастацтве і сёння нават не мае нейкіх меж і вызначаецца толькі досведам сучасных мастацкіх практык.

І тым не менш паспрабуем пазначыць аналізуемае паняцце ў кантэксце сучасных мастацкіх працэсаў. На наш погляд, эксперымент у мастацтве ("мастацкі эксперымент") уяўляе сабой разнавіднасць (працэс) інавацыйнай творчасці, унікальнай сістэмы мастацкага мыслення, якая прадугледжвае выхад за межы вядомых вобразных правілаў, норм і канцэпцый, сродкаў выразнасці, традыцыйных мастацкіх тэхнік і матэрыялаў, а таксама накіраваны на пошук арыгінальных спосабаў выказвання і новых шляхоў у мастацтве. Такім чынам, эксперымент у мастацтве паўстае ў апазіцыі да існуючых традыцый, а часам нават эпатажна і правакатыўна "кідае ім выклік", дапамагае твору набыць парадаксальнасць, якая "ўтварае жыццёвы нерв новага мастацтва" [3, с. 37]. Пры гэтым незалежна ад ступені мастацкага радыкалізму любы падобны

творчы жэст накіраваны на фарміраванне ў мастацтве новых сэнсаў.

Узнікненне ўсіх эксперыментальных форм у мастацтве абумоўлена жаданнем выказваць праз змест і форму твора характар, асаблівасці, "дух" часу. Эксперымент у мастацтве, так ці інакш (а часам вельмі тоесна!), злучаны з цікавасцю творцаў да актуальных праблем нашага жыцця (сацыяльных, эканамічных, экалагічных, гендарных і г.д.). Мастакі выкарыстоўваюць уласныя творы як платформу для выказвання асабістых поглядаў на рэаліі свету. Яны могуць быць даволі нязвыклымі і іранічнымі, але заўсёды накіраваны на тое, каб выклікаць у гледача адпаведную рэакцыю.

Большасць эксперыментаў, у межах новага гістарычнага перыяду, накіравана на пошук адказу на пытанне: што такое мастацтва? Такім чынам, дзякуючы эксперыментальным формам мастацтва не проста пашырае ўласную тэрыторыю, але набывае новыя вектары для свайго развіцця. Эксперымент нярэдка змяняе і грамадскія ўяўленні аб сэнсе і задачах мастацтва, ролі мастака ў развіцці культурных працэсаў.

Эксперымент у мастацтве патрабуе выкарыстання пэўных эксперыментальных метадаў і сучасны перыяд яго развіцця з уласцівым яму стылістычным плюралізмам, новым разуменнем меж мастацтва дае такую магчымасць. У сваю чаргу, удасканаленне эксперыментальных стратэгій у творах сучасных мастакоў вызначае сёння асаблівасці развіцця розных відаў мастацтва.

У любой галіне мастацтва эксперымент скіраваны на задавальненне творчай патрэбы мастака, уяўляе для яго спосаб самарэалізацыі, невычэрпную крыніцу натхнення. Ён садзейнічае разбурэнню стэрэатыпаў, фарміраванню новых каштоўнасцей і поглядаў, пошуку эфектыўных спосабаў адлюстравання ідэй і эмоцый. Перавага эксперымента над простым назіраннем рэальнага свету, адлюстраваннем бачнага відавочная. У межах эксперымента творца выяўляе неабходныя для яго рысы аб'екта, прымушае іх "працаваць на вобраз", які ён стварае. Пры гэтым мастак далёка не заўжды падкрэслівае сваю зарыентаванасць на эксперымент, адкрыта дэкларуе гэты факт. Нярэдка дадзеная навацыйнасць становіцца бачнай толькі пры аналізе твора ў агульным кантэксце развіцця мастацтва эпохі.

**Эксперымент і ўзроўні наватарства.** Ступень складанасці творчых задач, якія вырашаюць мастакі-эксперыментатары, у кожным канкрэтным выпадку розная. Не выклікае сумненняў той факт, што эксперыментальнасць, хутчэй за ўсё, вызначаецца ступенню наватарства. Напэўна, можна было б паспрабаваць выявіць узроўні паспяховасці эксперымента і прадэманстраваць, што адзін твор у вышэйшай ступені эксперыментальны, а іншы — толькі ў некаторай ступені. Аднак мы не бачым у гэтым сэнсу. Сапраўды, адны эксперыменты заклалі аснову для развіцця новых рухаў, іншыя сталі ўсяго толькі элементамі пэўных кірункаў у мастацтве. Ёсць і такія, што не адыгралі істотнай ролі ў яго развіцці на тым ці іншым этапе. Падобных эксперыментаў, якія можна было б назваць часова недапраяўленымі, было незлічонае мноства. Некаторыя з іх сталі сапраўднымі перадумовамі для з'яўлення значных змен у развіцці мастацтва ў будучым. Вышэйшай адзнакай часу становіцца прызнанне станоўчай ролі эксперымента ў з'яўленні прынцыпаў арыгінальнай эстэтыкі, новых варыянтаў мастацкага дыскурсу.

Агульнавядома, што далёка не заўсёды эксперымент у творчасці канкрэтнага мастака аказваецца паспяховым і вядзе да вынікаў, якіх чакаюць. Няўдача эксперымента — з'ява нармальная. Мастакі спрабуюць новае, каб убачыць, што з гэтага атрымаецца, і таму павінны разумець ступень творчай рызыкі, быць падрыхтаваны да магчымых памылак і няўдач.

На наш погляд, наўрад варта дзяліць эксперымент на асэнсаваны і неасэнсаваны. Паколькі відавочна, што ў любым выпадку яго вынік малапрадказальны. У сучасным мастацтве часам гэта проста цікавая візуальная гульня ці проста эстэтычны блеф. Бывае і так, што эксперыментальны твор больш удала выглядае на ўзроўні ідэі, чым на ўзроўні мастацкага ўвасаблення.

Сучасныя мастацкія практыкі шмат у чым дзякуючы звароту да эксперымента патрабуюць ад мастацтвазнаўцы, гледача, слухача і г.д. іншага "прачытання" твораў мастацтва. Паколькі эксперыментальныя стратэгіі ў развіцці сучаснага мастацтва непасрэдна ўплываюць на асаблівасці іх успрыняцця і крытэрыі адзнакі.

**Лакацыі эксперымента.** Разнастайнасць відаў, жанраў, форм сучаснага мастацтва сваім з'яўленнем і развіццём абавязаны эксперыменту, які злучаны з рознымі лакацыямі. Кожная з іх прадстаўляе творцам пэўны дыяпазон навацый і адпаведную свабоду пошукаў. Пазначым толькі некаторыя з лакацый эксперымента, якія ўласцівы мастацтву XXI стагоддзя.

Выдатнае поле для стварэння арыгінальнага твора ўяўляе *выкарыстанне ў ім магчымасцяў розных відаў мастацтва*

*і іх сродкаў выразнасці*. Сёння ў экспазіцыях сустракаюцца творы, якія спалучаюць прыёмы перформанса, кінематографа, тэлебачання, жывапісу, інсталяцыі, відэаарта і г.д. На аснове сінтэзу элітарных і масавых, класічных і некласічных відаў мастацтва фарміруюцца сінтэтычныя аб’екты, у якіх накіраванасць на сінестэзійнае ўспрыманне злучаецца з найноўшымі арт-тэхналогіямі.

Аб’яднанне відаў мастацтва ў новы сінтэтычны від, генерыраванне новых сэнсаў з’яўляецца прамым вынікам працэсу збліжэння і ўзаемапранікнення розных відаў творчасці. Часам узровень узаемадзеяння розных відаў мастацтва настолькі высокі, што варта весці гаворку пра сінтэз мастацтваў, іх арганічнае злучэнне ў адзінае цэлае, пра з’яўленне якасна новай мастацкай з’явы.

Яшчэ адной лакацыяй для правядзення мастаком эксперыментаў з’яўляецца *змест і паэтыка мастацкага твора*. Эксперымент можа датычыцца ўсіх элементаў інфраструктуры вобразнага поля і быць скіраваны на асэнсаванне актуальных тэм і канцэпцый. Канкрэтным матэрыялам для мастацкага эксперыментавання могуць служыць рэальныя факты, таксама як і спадчына сусветнага мастацтва. Нярэдка эксперыментальнае мастацтва закранае актуальныя праблемы сучаснасці, ставіць пытанні і правакуе дыскусіі. Фарміраванне новай вобразнасці звязана з пабудовай і новай сістэмы сувязяў паміж элементамі, у якой даволі часта важная роля нярэдка належыць прынцыпам калажу.

Далёка не заўжды эксперымент уяўляе радыкальны разрыў з мінулым, адмаўленне ад спадчыны і традыцый. У такіх выпадках, выходзячы за межы звыклага, эксперыментальнае мастацтва нібы вядзе з імі дыялог, пераасэнсоўвае гістарычны вопыт.

Найбольш папулярнай лакацыяй для эксперыментаў, безумоўна, з’яўляюцца *форма і сродкі выразнасці*. Эксперыменты з прасторай і формай, выкарыстанне новых матэрыялаў, тэхнік і тэхналогій адкрываюць для мастакоў новыя далягляды творчасці. Акрамя вядомых тэхнік нават у традыцыйных відах мастацтва ўзнікаюць новыя, выкарыстанне якіх дазваляе мастаку раскрыць сваю індывідуальнасць, узбагаціць уласны мастацкі вопыт. Адны творцы эксперыментуюць з рознымі матэрыяламі, інструментамі, магчымасцямі колеру, фактуры, тэкстуры, іншыя — з асаблівасцямі канструявання прасторы, аб’ёму, выкарыстання святла, гуку і г.д.

Пошукі новых тэхналагічных алгарытмаў — яскравая рыса сучаснага мастацтва. Сённяшні свет прапануе мастакам бясконцае мноства інструментаў для творчасці: лічбавыя тэхналогіі, інтэрактыўныя інсталяцыі, штучны інтэлект, дапоўненую рэальнасць і інш. Развіццё і ўдасканаленне тэхналогій, іх інтэграцыя з мастацтвам паспрыялі стварэнню вялікай колькасці сінтэтычных мастацкіх форм.

Хоць і не новымі, але папулярнымі ў XXI ст. застаюцца эксперыменты мастакоў з утыльсыравінай. У шырока вядомым трэш-арце (ад англ. trash — смецце) ламаюцца стэрэатыпы аб матэрыялах для творчасці, аб мастацкім гусце.

Нельга не сказаць і пра “свежае дыханне” ў апошнія дзесяцігоддзі добра вядомых форм science-арта (бія-арта, нана-арта, медыя-арта, саўнд-арта, светлавога мастацтва і інш.), якія тоесна злучаны з інжынернымі тэхналогіямі і хімічнымі эксперыментамі. У гэтых формах мастацтва паўстае як інварыянт эксперыментальнай навукі. Вышэйшай ступенню фармальнага эксперымента становіцца асэнсаванне формы як асноўнага зместу твора, як яго вобразнай дамінанты.

Сёння эксперыментальным можа быць не толькі асобны твор, але і цэлая выстава, мастацкі праект. Аўтарам падобнага эксперымента ў галерэі або яго суаўтарам, суарганізатарам, правадніком, разам з мастакамі, якія ўдзельнічаюць у праекце, становіцца яго куратар. Прастора выставачнай залы пры гэтым ператвараецца ў сапраўдную лабараторыю ідэй і эмоцый. У куратарскіх праектах нярэдка ўвасабляюцца смелыя задумы, дзе мастакі могуць дазволіць сабе выйсці за межы звыклага і зразумелага.

**Пошукі новых форм камунікацыі.** Сучаснае і тым больш эксперыментальнае мастацтва не імкнецца задавальняць чаканні шырокай аўдыторыі, аднак зарыентавана на пошук новых форм узаемадзеяння з аўдыторыяй.

Тэрыторыю мастацтва значна змянілі шматлікія варыянты так званага імерсіўнага мастацтва, якое скіравана на тое, каб поўнасцю пагрузіць гледача ў сваю вобразную прастору, стварыць у яго эфект прысутнасці. Звычайна імерсіўныя арт-праекты задзейнічаюць усе органы пачуццяў яго наведвальнікаў і зарыентаваны на шырокі дыяпазон мультысэнсарных уражанняў.

Імерсіўнае мастацтва даволі разнастайнае. Яно можа ўключаць у сябе маштабныя інсталяцыі, віртуальную (VR), дапоўненую (AR) і змешаную (MR) рэальнасць. Нярэдка гэта велізарныя мастацкія інсталяцыі,

з выкарыстаннем вялікай колькасці экранаў, спецыяльных эфектаў, розных сучасных тэхналогій. Падобныя мастацкія праекты сціраюць межы паміж рэальнасцю і ўяўленнем, запрашаюць гледачоў узаемадзейнічаць з мастацтвам у рэжыме рэальнага часу, адкрываюць новыя магчымасці для ўспрымання і інтэрпрэтацыі мастацтва, робяць яго больш захапляльным.

Інтэрактыўныя мастацкія практыкі прадугледжваюць "уцягванне" гледача ў працэс стварэння і асэнсавання твора. А разнастайныя віды эксперыментальнага мастацтва ператвараюць гледача з пасіўнага назіральніка ў су-творцу мастака, пасоўваюць да адкрытасці, пашырэння меж яго ўспрымання, запрашаюць да дыялогу.

**Заключэнне.** Такім чынам, мастацкі эксперымент з'яўляецца важным элементам сучаснага мастацтва, яго творчай парадыгмай. Развіццё навукі і тэхналогій у першай чвэрці XXI стагоддзя значна змянілі сучаснае мастацтва, цалкам зарыентавалі яго на пошукі навацыйных вобразных форм і відаў камунікацыі з наведвальнікамі выстаў. Эксперыменты ператварыліся ў сапраўдны рухавік творчага росту сучасных мастакоў. Адкрытасць жа да новых ідэй і метадаў дазволіла ім знайсці новыя крыніцы натхнення.

Дадзены тэкст не глыбіннае даследаванне, а хутчэй разважанне над асноўнымі аспектамі ролі эксперымента ў сучасным мастацтве. Відавочна існуе іншы ўзровень інтэрпрэтацыі гэтай праблемы. І ён павінен абавязкова зацікавіць даследчыкаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Маньковская, Н.Б. Современное искусство как феномен техногенной цивилизации / Н.Б. Маньковская, В.В. Бычков. — Москва: ВГИК, 2011. — 208 с.

2. Афасижев, М.Н. Функции эксперимента в различных видах искусства прошлого и первой половине XX века / М.Н. Афасижев // Экспериментальное искусство: влияние теории на художественное творчество: сб. ст. / под ред. О. Личчиарделло, С. Ломбардо, В. Петрова; Гос. ин-т искусствознания. — Москва, 2011. — 412 с.

3. Адорно, В. Теодор. Эстетическая теория / Теодор В. Адорно. — М.: Республика, 2001. — С. 58.

*Паступіў у рэдакцыю 04.08.2025*